# З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА СЕСІЯ

Зараз для нас гэта толькі прыемныя ўспаміны. Здаецца, не было турбот і хваляванняў.

...Вокны ленінскага пакоя інтэрната, што на Паркавай, свяціліся за поўнач. Шалясцелі старонкі кніг, пароіі спрачаліся паміж сабой будучыя юрысты. Але Федзю Сагановічу яны не перашкаджалі. Для яго, як і для Таццяны Аборынай, Людмілы Казімірскай, рабочая атмасфера «чыталкі» стала звыклай.

А на семінарскіх і практычных занятках упэўнена адказвалі Таня Кобрына і Віталь Зямскоу, нястомны аматар спрэчак Віталь Мухін задаваў каверзныя пытанні, падтрымлівалі ці абвяргалі яго прапановы Віця Аучарэнка і Лёня Петэрсон.

Так жыў другі курс: сур'ёзная падрыхтоўка да практычных і семінарскіх заняткаў, удзел у СНТ, самастойная работа над першакрыніцамі, гарачыя спрэчкі на перапынках. Лозунг «веды—сілай» не ў пашане другакурснікаў. Журналіст —гэта інтуіцыя плюс эрудыцыя — рашылі яны, таму сесія на другім курсе пачалася не шостага, нават не першага студзеня. Значна раней.

Вынікі не замарудзілі сказацца.

### ЯК ГЭТА БЫЛО...

Калідор гудзеў. У кутку нехта ў апошні раз уважліва чытаў канспект, нехта паспешна засоўваў у кішэні шпаргалкі, усхвалявана шэпчучы: «Ратаванне тонучых — справа рук саміх тонучых».

Але Шаравай шпаргалкі не спатрэбіліся. Калі яна адказвала, нават той, хто рыхтаваўся накіравацца да стала экзаменатара, міжволі заслухаўся. Жывы і цікавы расказ, дакладныя і вычэрпваючыя адказы на дадатковыя пытанні. І заслужаная адзнака — пяцьбалаў. Гэта была яе трэцяя пяцёрка. Пятнаццаць балаў набралі і Таня Кобрына, і Лёня Віцітнеў, і Таня Кацнельсон, і Анатоль Смольскі... Трынаццаць чалавек атрымалі круглыя пяцёркі.

Так для другакурснікаў закончылася зімовая сесія.

### СПРОБА ПРАГНОЗУ

Дык вось, першы этап барацьбы ў спаборніцтве на лепшую групу пройдзены. Другі курс — першы на журфаку; другая група — лепшая на курсе. Як зусім аўтарытэтна заявіў старшыня прафбюро журфака Мікалай Толсцік, гэта група будзе прадстаўлена для узнагароджання пуцёўкай для паездкі ў Ленінград.

Але... Калі акрыленыя поспехам другакурснікі з пачуццём законнага гонару разглядваюць табліцу вынікаў зімовай сесіі, студэнты трэцяга курса з'едліва ухмыляюцца: «Што вы летам скажаце?!» І па курсу паўзуць страшныя чуткі аб кашмарнай летняй сесіі: дзве курсавыя работы плюс безліч праграмнай літаратуры, шэсць-сем экзаменаў і спецкурс пад таямнічай назвай «Ілюстрацыя у газеце» (раптам гэта фотасправа?).

Страшна? Так. Але не безнадзейна.

І зноў выдатна адказвае на занятках па нямецкай мове Таня Харэўская, настойліва задае пытанні на лекцыях па марксісцка-ленінскай філасофіі Уладзімір Трусаў, карпатліва працуе над курсавой Таня Кацнельсон.

Другі курс прыступіў да работы.

Значыць, будзем спадзявацца?!

**Г. ПЛІГАЎКА,**
**студэнтка II курса журфака.**



# ВЕТЛІВАСЦЬ І ДАБРАЧЫННАСЦЬ

**Гэтыя два паняцці не хочацца раз'ядноўваць, яны павінны стаяць побач. За знешняй прыветнасцю, прыкметамі выхаванасці і культуры маладога чалавека не павінны хавацца эгаізм, абыякавасць, лянота.**

**У пакой да першакурснікаў заўсёды прыемна было зайсці. Запрасяць сесці, вядуць шчырыя размовы аб будучай прафесіі. Але добрае ўражанне сапсаваў адзні выпадак. Стукаю аднойчы ў дзверы знаёмага пакоя. Адчыняюць з вялікай неахвотай. Спачатку здзіўляюся, а потым разумею, чаму. У пакоі накурана, падлога брудная, на стале шматкі паперы, астаткі ежы, акуркі.**

**— У інтэрнаце чакаецца праверка, а наш дзяжурны дзесьці затрымаўся на занятках. Вось мы і зачыніліся на замок, — апраўдваючыся, сказаў М.**

**Трое маіх знаёмых студэнтаў ляжалі на ложках, відаць, пасля абеду. Самі накурылі, не ўбралі за сабой са стала і спакойна чакаюць, калі прыйдзе дзяжурны, навядзе парадак. А спытай іх, кожны адкажа, што некультурна трымаць рукі ў кішэнях, перабіваць старэйшых у размове і г. д.**

**Давайце усцешым сябе думкай, што першакурснікі выправяцца, у іх ёсць для гэтага усе магчымасці.**

**Сур'ёзна непакоіць іншае. Перад канікуламі камендант інтэрната № 4 папярэджваў сваіх выхаванцаў: «Вы ж, ад'язджаючы дадому, прыбярыце лакоі, а то няёмка будзе перад завочнікамі».**

**Добра. Не асароміліся стацыянарнікі перад завочнікамі. А атрымалася наадварот.**

**— У нас замкі у дзвярах паламалі, паадрывалі ручкі, — скардзяцца дзяўчаты з пакояў №№ 139, 145.**

**Што ўжо казаць пра бутэлькі, смецце, пакалечаныя сталы і крэслы! Бясспрэчна, камендант павінен патрабаваць і ад завочнікаў падтрымліваць чысціню, парадак. Але як гэта выглядае з пункту гледжання нашай марапі! Такі гармідар пасля сябе пакінулі завочнікі, якія, у прыватнасці, працуюць настаўнікамі, вучаць дзяцей культуры, ветлівасці, маральнай чысціні...**

**Адсюль і ўзнікае сумны разлад паміж словамі і справамі, паміж напускным, знешнім і ўяўным, істотным. І як вынік гэтай неадпаведнасці бытуюць сярод нас хлусня, пустазвонства, разбэшчанасць. На першы погляд прыемны малады чалавек раптам становіцца нягоднікам, абяцаючы ў вернасці — здраднікам, моцная валявая натура — нікчэмнасцю.**

**Юнакі, якія галантна прапускаюць дзяўчат наперад, просяць дазволу закурыць, першымі вітаюцца і разам з тым без чаргі лезуць да прылаўка, дзе здаюць кнігі, не уступяць старому ці інваліду месца у тралейбусе, могуць рынуцца напралом у фоталабараторыю, каб заняць лепшае абсталяванне, перададуць брудную плётку на таварыша.**

**Цяжка, нават немагчыма прыкрыць нейкімі знешнімі элементамі культуры свае заганы. Рана ці позна яны праявяцца. Лепш за усё сваю ветлівасць, добразычлівасць падмацоўваць справамі, учынкамі. Не імкнуцца выглядаць культурным, уважлівым, выхаваным, а быць ім. Па адзенню чалавека сустракаюць, а па розуму праводзяць. Прыгожымі павінны быць у чалавеку і адзенне, і думкі, і справы.**

**П. ЛЯОНАЎ,**
**студэнт.**

# ТРЭНІРУЮЦЦА ГІМНАСТКІ

Пачаўся новы вучэбны семестр. Закіпела работа у кабінетах, лабараторыях, бібліятэках. Зноў шумна стала і у спартыўных залах універсітэта.

...У гімнастычнай зале трэніруецца група дзяўчат. Сярод іх майстар спорту па спартыўнай гімнастыцы Тамара Яфрэменка. Яшчэ вучаніцай сярэдняй школы юная віцяблянка удзельнічала ва усесаюзных спаборніцтвах. Зараз Тамара Яфрэменка — студэнтка другога курса фізічнага факультэта і таксама не растаецца з гімнастыкай. Выступаючы у розыгрышы кубка спартыўнага таварыства «Буравеснік», яна стала прызёрам. У мінулым годзе на першынстве вну рэспублікі па спартыўнай гімнастыцы заняла другое месца.

— Цяпер, — гаворыць Тамара, — зноў напружаныя дні трэніровак — рыхтуемся да універсіяды рэспублікі, якая адбудзецца у сакавіку ў нашым горадзе. Саперніцы у нас будуць даволі сур'ёзныя — гімнасткі з Гомельскага універсітэта. Працаваць давядзецца многа. Але я і мае сяброўкі не губляем надзеі на перамогу і спадзяемся, што трапім на усесаюзную універсіяду.

Хвалюецца за сваіх выхаванак і іх трэнер, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Ігар Васільевіч Пазновіч.

Цяжкі шлях да перамогі. Але ж перамога дастаецца упартым, вытрыманым, працавітым, а гэтыя якасці ёсць у яго выхаванак — студэнтак Т. Чупраковай, Р. Чэхавай, Л. Жыгуновай, І. Пакрыцынай, А. Рашчынскай.

**Г. НАУМЧЫК.**

ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ

# ГАСПАДАРЫ ЦІ КВАТАРАНТЫ?

«Якія самі, такія і сані»— падкрэслівае народная прымаўка тое, што рэчы вельмі падобны на гаспадара. Пераканалася у гэтым і наша рэйдавая брыгада, калі наведала інтэрнаты універсітэта.

Інтэрнат № 1. Заўважыўшы членаў прафкома у суправаджэнні незнаемых, дзяжурныя пільна запатрабавалі:

— Пропуск!

Знайсці ідэальны парадак тут мы не спадзяваліся. На першым паверсе рамонт, узарвана падлога, вакол будаўнічыя матэрыялы. Адсюль разбягаюцца белыя сляды па усіх лесвіцах і калідорах. Ды яшчэ камендант інтэрната Надзея Сяргееўна Галіна зараз хварэе. Суправаджаць нас узяўся старшыня студсавета Аляксандр Гайдаманчук. І вось.

Кухня на другім паверсе не прыбрана, вакол бруд, смецце. І зусім непрыглядны малюнак у пакоі № 139. Спёртае паветра, накурана, на стале аб'едкі ад абеда і многа бутэлек у шафе. Ложкі скамечаны, і на адным з іх, як увасабленне неахайнасці, расцягнуўся хлопец у верхняй вопратцы і кедах. Не пакой, дзе жывуць студэнты, а сапраўдная карчма.

І у 133 пакоі зноў нечаканасць! За сталом абедаюць дзяўчаты, а побач на ложку з ускудлачанымі валасамі у верхняй вопратцы спіць хлопец.

— Хто гэта, госць ці родзіч чый? — пытаем.

— Не, наш студэнт, неахвотна і сумеўшыся адказваюць дзяўчаты.

З цяжкасцю, усё ж прымушаем хлопца падняцца, назваць сябе. Аказваецца, гэта Яромін з геаграфічнага факультэта. І без экспертызы можна было заўважыць, што агульны сябра дзяўчат не зусім цвярозы.

Але не трэба думаць, што у інтэрнаце № 1 адны непарадкі. Больш добрага, станоўчага. Радуе уменне дзяўчат, што жывуць у пакоях №№ 90, 102 «В», № 36 і іншых ствараць хатнюю утульнасць. Заходзіш да іх, і складваецца уражанне, што тут жывуць сапраўдныя студэнты, якіх нешта цікавіць, у якіх ёсць свае ідэалы. І прыгожая ваза на стале, і малюнкі, сувеніры, прывабна аформленыя кніжныя паліцы — усё гэта красамоўна гаворыць аб іх добрым эстэтычным гусце. Пагутарыць з імі таксама цікава. Дзяўчаты чытаюць мастацкую літаратуру, ходзяць у тэатр і кіно.

Любяць чысціню і парадак не толькі дзяўчаты. Самымі акуратнымі лічацца студэнты з пакоя № 48, дзе старастам Мікалай Кажура. У гэтым пакоі стаіць тэлевізар — прыз за лепшыя паказчыкі у аглядзе. Цеснавата, вядома, па шэсць чалавек у невялічкім пакоі. Але жыць можна. Толькі самім патрэбна упрыгожваць і аздабляць свой быт, а каменданту паклапаціцца, каб студэнтам было дзе памыць, высушыць і адпрасаваць сваю бялізну і вопратку.

У больш зручных умовах жывуць студэнты інтэрнатаў № 5 і № 6. Тут кухні лепш абсталяваны, ёсць бытавыя пакоі, жывуць у асноўным тут студэнты па чатыры чалавекі. Але зноў прычына адна: дзе студэнты адчуваюць сябе паўнапраўнымі гаспадарамі, — там і чысціня, і утульнасць, а дзе толькі кватарантамі ці падапечнымі, — там і скаргі, няўладзіца, бруд. Хто хоча жыць у інтэрнаце культурна, змястоўна, можа дабіцца гэтага. Прафком, камітэт камсамола і рэктарат універсітэта заўсёды ідуць насустрач такім, ухіляюць перашкоды. Не трэба толькі нянчыцца з дэбашырамі, п'яніцамі і лодарамі, якія атручваюць многім жыццё. У сваім інтэрнаце кожны павінен быць строгім, патрабавальным членам студэнцкай сям'і.

**В. КАЗЛЕНКА,**
**намеснік прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы.**
**Л. САБАЛЕЎСКІ,**
**старшыня прафкома універсітэта.**
**А. ЗЛОТНІКАЎ,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома.**
**Л. ПЕТЭРСОН,**
**супрацоўнік газеты «Беларускі універсітэт».**

- *Заўседы утульна у вестыбюлі студэнцкага інтэрната.*
- *Дзяўчат праверка не турбуе: у пакоі чысціня.*
- *Працоўная цішыня у ленінскім пакоі.*
- *Сталовая інтэрната № 5.*







# З МУЗЫЧНЫМ ПРЫВІТАННЕМ



✦ Гомель... Старажытны прыгажун-горад на Сожы. Ён сустрэу нас як добры сябар, як клапатлівы гаспадар. Гамяльчане, студэнты і выкладчыкі дзяржаунага універсітэта, зрабілі усё для таго, каб удзельнікі мастацкай самадзейнасці БДУ імя Леніна адчувалі сябе у іх горадзе як дома: загадзя былі падрыхтаваны месцы у студэнцкім інтэрнаце, арганізавана экскурсія па горадзе. Гордасць гамяльчан — казачны парк імя А. В. Луначарскага, шырокія вуліцы і праспекты, высотныя гмахі-дамы, помнікі старажытнасці — усё гэта адразу ж уразіла і зацікавіла мінчан.

На жаль, час для агляду быу абмежаваны. Кожны ведау, што прадстаіць сустрэча з гамяльчанамі: вялікая маляунічая афіша у вестыбюлі галоунага корпуса ГДУ апавяшчала аб маючым адбыцца канцэрце мінчан. Задоуга да пачатку яго — рэпетыцыя. Хвалююцца. Спакойным здаецца толькі твар Уладзіміра Іосіфавіча Раговіча — мастацкага кіраунікa і дырыжора народнай харавой капэлы. Камусьці дае апошнія заувагі перад канцэртам, кагосьці супакойвае, а усім разам сваімі паводзінамі і выглядам стварае добры настрой. І усё ж калі больш пільна прыгледзецца, можна заувэжыць, што непакоіцца ён больш за усіх. Але як умее валодаць сабой!

✦ Занавес павольна рассоуваецца. Гледачы апладысментамі вітаюць самадзейных артыстау. Лёгкі, плауны узмах рук дырыжора, і першыя акорды нібы утаймавалі гаманлівую залу, нібы заваражылі яе. Зладжана спяваюць хлопцы і дзяучаты. Словы песні аб Леніне плывуць, перaлівaюцца. Гучаць, дагараюць апошнія яе радкі. Некалькі імгненняу цішыні, і нібыта раптоуны раскат грому скаланууу залу. Гледачы не могуць схаваць свайго захаплення, апладзіруюць і апладзіруюць. Радасныя усмешкі на тварах выканауцау. Задавальненне і удзячнасць і слухачам, і выканауцам на твары У. І. Раговіча. І сапрауды такому рэагаванню слухачоу мог бы пазайздросціць нават прафесіянальны калектыу.

А харавая капэла спявае новыя і новыя песні розных народау свету, беларускія нацыянальныя, старадаунні студэнцкі гімн на лацінскай мове. Песні захапляюць, чаруюць стройнасцю гучання, меладычнасцю, задорам і лёгкасцю. Вось дзе сапрауднае майстэрства!

Успамінаецца размова з артыстамі капэлы.

**Галіна Лаунік,** студэнтка геафака, староста жаночай групы хору:

— У. І. Раговіч працуе з намі крыху больш года. З яго прыходам калектыу стау больш дружным, згуртаваным. Дружбе і зладжанасці спрыяе і тое, што мы адчуваем сябе блізкімі дарадчыкамі Уладзіміра Іосіфавіча. Заусёды разам падбіраем новыя песні, кожны з нас прымае удзел у абмеркаванні рэпертуару.

**Уладзімір Сосна** (гістарычны факультэт, II курс):

— Ведаеце, Уладзімір Іосіфавіч для мяне аутарытэт не толькі у музычным майстэрстве, але і у чалавечых паводзінах. Хочацца мець такую ж стрыманасць, волю, высокую культуру паводзін, як у яго. Наш кіраунік не толькі чуе тэнар ці сапрана у хоры, але умее бачыць настрой кожнага, зразумець яго, адчуць. Яго ветлівасць і клапатлівасць, дабрадушнасць і непасрэднасць вельмі удала спалучаюцца з высокай патрабавальнасцю да нас як да выканауцау. У той жа час яго цікавяць не толькі вывучаныя намі партыі, але і поспехі у спорце, наш адпачынак, нашы сесіі.

З Галінай і Уладзімірам нельга не згадзіцца. Хочацца дадаць адзінае: некалькі год назад У. І. Раговіч таксама працавау з харавой капэлай нашага універсітэта. Іменна тады калектыву было прысвоена імя народнага. Гэта гаворыць само за сябе.



✦ У залу урываецца рытмічная музыка эстраднага аркестра. Спевакі змяняюць адзін аднаго. Песні у выкананні салістау аркестра Э. Ясінскай, Л. Якубоускай, А. Федарынскага мелі поспех і, трэба спадзявацца, што гэта будзе спрыяць іх далейшаму творчаму росту. Дасканала і па-майстэрску праспявау песню «Пра маленькага трубача» і «Белая цішыня» Алег Ярашэнка. Паспяхова выступілі чытальнікі Л. Бялова і Ю. Шыкло.

✦ Высока ацанілі выступленне нашых артыстау гамяльчане. Былі і некаторыя заувагі. Вось, напрыклад, што сказау Аляксей Пятровіч Лукомскі, заслужаны дзеяч культуры БССР. Як музыкант ён быу у захапленні ад выступлення харавой капэлы. А вось аб культуры паводзін на сцэне некаторых удзельнікау эстраднага аркестра у яго засталіся дрэнныя уражанні, хаця А. Крыштопенка, Я. Гваздкоу, А. Максімау, В. Яравы добра выконвалі свае музычныя нумары.

Два дні гасцілі мінчане у Гомелі. У нядзелю, 15 лютага, яны выступілі ва універсітэце з развітальным канцэртам. Старшыня прафкома Валянціна Чукалёва і сакратар камітэта камсамола Ігар Эсмантовіч горача дзякавалі самадзейным артыстам за добрыя канцэрты. У знак шчырай удзячнасці ад імя рэктарата, парткома, прафкома, камітэта камсамола, студэнтау універсітэта кірауніку дэлегацыі В. Літвінку былі уручаны каштоуны падарунак, грамата і памятныя сувеніры.

✦ Паездка калектыву мастацкай самадзейнасці БДУ імя У. І. Леніна да студэнтау Гомельскага універсітэта была не толькі прыемным сяброускім візітам, але і своеасаблівай перадачай вопыту. Высокае майстэрства нашых артыстау натхніла студэнтау маладога універсітэта, захапіла іх сваім характарам. Таварышы з Гомеля абяцалі: «Вясной мы прыедзем у Мінск са сваім канцэртам, пастараемся зрабіць усё, каб і у Гомельскім універсітэце была такая ж выдатная самадзейнасць».

Нашы артысты пажадалі сваім сябрам поспеху у гэтым выдатным імкненні.

**А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

*НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) нязменны поспех заусёды суправаджае выступленні студэнтак філфака Э. Ясінскай і Л. Якубоускай. (Унізе) беларускай песняй вітае гамяльчан харавая капэла.*

●●●

# У СВЕЦЕ ЦІКАВАГА

### МОРА ЗАПАЛЬВАЕ АГНІ

Марскі буі, створаны японскімі інжынерамі, працуе ад энергіі марскіх хваль. Хвалі раскалыхваюць буй, прыводзяць у рух маятнік, а той круціць генератар, і лямпа на вяршыні буя свеціцца.

### ПЛАСТМАСА ДЛЯ БРЫЦЦЯ

Менавіта такое неспадзяванае прымяненне знайшоў сабе тэфлон, інакш яшчэ называемы фторапластам, — рэчыва, у састаў якога ўваходзіць фтор. Калі вы возьмеце кусок тэфлона ў рукі, ён пакажацца вам намыленым, такі ён слізкі. Гэта уласцівасць пластмасы прыцягнула ўвагу фабрыкантаў брытвенных лязо. Вастрыё пакрываюць танчэйшым слоем тэфлона, і яно слізгаецца па скуры, не раздражняе яе. А брые лязо па-ранейшаму добра.

### СВЕТАВЫ РУХАВІК

Сінтэтычныя валокны паспяхова сапернічаюць з шоўкам, шэрсцю, а цяпер—як быццам нават з бензінам і электрычным токам. Прафесар Джуліо Ната (Італія) выявіў, што створанае ім валакно пад уплывам цяпла сціскаецца, а пасля астуджэння ўтрымлівае ранейшую даўжыню. Прафесар прымацаваў да каленчатага вала чатыры ніткі з новага валакна і стаў па чарзе асвятляць іх цеплавымі промнямі інфрачырвонай лямпы. Валокны адно за другім скарачаліся і круцілі вал. Заставалася дабіцца аўтаматычнага пераходу цеплавога промня з адной ніці на другую, што аказалася справай нескладанай. Светавы матор працуе!

●●●

# АДПАЧЫЛІ ДОБРА!

Цікава правялі канікулы студэнты універсітэта. Разам з савецкімі сябрамі у інтэрнацыянальным спартыўна-аздараўленчым лагеры, што быў створаны на базе пансіяната ЦК ЛКСМБ «Юнацтва» на беразе Мінскага мора, адпачывалі замежныя студэнты.

— Адпачываць мы пачалі ужо у дарозе, — расказвае студэнт юрфака Самір Шахін. — У аўтобусе спявалі рускія песні, любаваліся снегам і соснамі.

Цудоўнае ўражанне выклікала само размяшчэнне будынка. Сосны-веліканы абдымаюць яго з усіх бакоў. Побач размешчана турбаза, дзе ў любы час можна было атрымаць лыжы.

У нашу змену адпачывалі студэнты з Судана, Йемена, Сірыі, В'етнама.

Днём хадзілі на лыжах нягледзячы на мароз. Для нас гэта было не толькі задавальненнем, але і ў пэўнай ступені рызыкай, таму што мы больш падалі, чым каталіся.

Пасля абеду праводзілі час хто як хацеў: адны садзіліся за шахматы або ішлі падыхаць лясным паветрам, іншыя аддавалі перавагу сну. А вечарамі зноў збіраліся разам на інтэрнацыянальных вечарах і сустрэчах.

З вялікай увагай мы слухалі лекцыю аб вялікім барацьбіту за мір і справядлівасць ва ўсім свеце У. І. Леніне. Мы не проста тады уважліва слухалі. Лектар так цудоўна гаварыў, што нам здавалася, нібы гэта мы знаходзімся на вуліцах Петраграда у час рэвалюцыі. Карыснай была і сустрэча з дэлегатамі, удзельнікамі 3-га Усесаюзнага з'езда калгаснікаў.

І канешне, вечарамі мы танцавалі. І было не толькі весела, але і дружна. Можна сказаць, што гэта быў інтэрнацыяналізм на практыцы.

Таму мне вельмі хочацца, — заканчвае сваё пісьмо у рэдакцыю Самір Шахін, — ад імя усіх замежных студэнтаў падзякаваць усім тым, хто прадаставіў нам такі незабыўны адпачынак.

* * *

Вялікая група замежных студэнтаў падрыхтоўчага і асноўных факультэтаў зрабіла экскурсію па ленінскіх мясцінах. Студэнты ездзілі у горад-герой на Няве, пабывалі ў Разліве, наведалі філіял Цэнтральнага музея У. І. Леніна, музей рэвалюцыі, легендарны крэйсер «Аўрора», Ісакіеўскі сабор, Эрмітаж і іншыя музеі Ленінграда.

**М. ДЗЯДКОВА,**
**М. КРЭСІК.**



**Рэктарат, партком, мясцком, кафедры гісторыі КПСС гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў глыбока смуткуюць з выпадку смерці дацэнта Мікіты Ермалаевіча ГРАКАВА, члена КПСС з 1927 г. і выказваюць глыбокае спачуванне сям'і і блізкім нябожчыка.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 22006. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Т-22-07-19. Тыраж 2.000 экз. Зак. 263.